**Н. А. Сякацкая**

# ЭКАЛАГІЧНАЯ ЭСТЭТЫКА ПЕЙЗАЖНЫХ ВОБРАЗАЎ У ПАЭЗІІ МАКСІМА ТАНКА

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*sekatskaya.nata@mail.ru;*
*навук. кір. – А. І. Бельскі, д-р філал. навук, праф.*

Артыкул прысвечаны асэнсаванню праблемы ўзаемасувязей чалавека і прыроды ў творчасці Максіма Танка. Мэтай даследавання з’яўляецца выяўленне сутнасці экалагічнай эстэтыкі пейзажных вобразаў у лірыцы паэта. Раскрываецца ідэйна-мастацкі змест і мастацкія асаблівасці вершаў экалагічнай тэматыкі. Праведзенае даследаванне дае магчымасць паглыбіць уяўленне пра светапогляд, мастацкае мысленне Максіма Танка, асаблівасці яго паэтыкі.

***Ключавыя словы:*** лірыка Максіма Танка; пейзажны вобраз; экалагічная эстэтыка; экалагічны імператыў; тэма экалогіі.

Паняцце «экалагічная эстэтыка» з’явілася, калі ўзнікла неабходнасць выпрацаваць нормы паводзінаў чалавека, рэкамендацыі, накіраваныя на беражлівыя адносіны да прыроды. У другой палове XX ст. глабальная праблема ўзаемасувязей чалавека і прыроды пачала разглядацца ў кантэксце культуры. Экалагічная эстэтыка, што ўзнікла на перасячэнні экалогіі як спецыяльнай навуковай дысцыпліны і эстэтыкі, набыла свой статус як эстэтыка навакольнага асяроддзя. На першым плане аказаліся пытанні ўзаемасувязей эстэтыкі і этыкі, эстэтыкі і навукова-тэхнічнага прагрэсу [3].

Праблема адносінаў чалавека да прыроды шырока адлюстравалася ў беларускай літаратуры. У аспекце акрэсленай тэмы вялікую каштоўнасць уяўляе праца П. Васючэнкі «Беларуская экалітаратура на фоне еўрапейскага літаратурнага працэсу» [5, с. 317–364]. Аўтар артыкула звяртае ўвагу на тое, што фарміраванне «экалагічнага мыслення было працэсам сінхранізаваным і ўзаемаабумоўленым, які прывёў у другой палове XX ст. да вылучэння экалагічнай мастацкай літаратуры як жанравага кірунку» [5, с. 318].

Адным з беларускіх пісьменнікаў, якія ўсведамлялі эстэтычную, духоўную каштоўнасць роднай прыроды, патрэбу ў яе экалогіі, быў Максім Танк. Паэт глядзеў далёка наперад, імкнуўся давесці да чытача думку пра тое, што развіццё грамадства павінна быць прадуманым, узважаным і не прыносіць шкоды навакольнай прыродзе.

Клопат пра стан навакольнага асяроддзя быў цесна звязаны з бязмежнай любоўю паэта да прыроды роднага краю. Краявіды малой радзімы непарыўна звязаны з мастацкімі вобразамі, намаляванымі ў вершах: Нарач, родная вёска Пількаўшчына, нарачанскія сосны, бары, валуны, нарачанскія лугі, сенажаці і да т. п.

Максім Танк стварыў яркія, маляўнічыя пейзажныя замалёўкі і карціны. У вершах «Мой родны кут», «Дым над страхою», «Наднарачанскія сосны» і іншых творах ён паэтызуе роднае, прыгожае, выказвае пачуццё замілавання, бязмежнай любові да таго краю, дзе нарадзіўся і вырас. У вершы «Зара над Нараччу» аўтар захапляецца зарой і на рамантычны лад увасабляе паэтычную думку: каб усе кавалі разам распалілі жар у горане, сабраўшы «ўсе скарбы // І срэбра і золата, // І з усіх зор», то не змаглі б выкаваць «гэткай зары, // Як над Нараччу» [2, с. 280]. Максім Танк стварае адметную вобразна-маляўнічую карціну ўсходу сонца, на якой бясхмарнае неба, «спяць нівы бязмежныя», «шумяць саснякі прыбярэжныя». Усё напоўнена чароўным спакоем.

Паказваючы рознабаковасць поглядаў людзей, Максім Танк у вершы «Заява ў гарсавет» прыводзіць прыклад адносінаў да прыроды чыноўнікаў. «Загадкульт гарсавета» за паперамі забыўся аб прыгажосці прыроды, яе значнасці ў жыцці людзей, не заўважыў прывабнасці зелені каштанаў, кветак. Адзінае хвалюе яго: «справы культуры стаяць невысока» [6, с. 21]. Павысіць узровень культуры ён вырашыў шляхам прыбівання да дрэў шыльдачак з інфармацыяй пра іх назвы і колькасць сукоў ды лістоў, запаўнення скверу рэкламай і фотаздымкамі футбалістаў. Ад такіх новаўвядзенняў парк страціў былое хараство. Максім Танк выступае за натуральную прыгажосць прыроды, адвечную красу, якая вабіць чалавека сваёй велічнасцю і непаўторнасцю. Ён імкнуўся да ўніверсальнага спасціжэння свету праз адзінкавае, канкрэтнае. «Паэтычная натурфіласофія, касмагонія М. Танка сцвярджае адзінства і непарушнасць усяго жывога на Зямлі» [1, с. 50].

Мастак слова надае прыродзе як эстэтычнае, так і філасофскае вымярэнне. З пейзажнымі вобразамі і матывамі звязана ўвасабленне аўтарскіх медытатыўных рэфлексій, душэўных станаў-настрояў. Родная зямля для паэта – святыня, з якой ён звязвае думкі пра высокае і вечнае: «О родная зямля! // Ты – кніга вечнага жыцця // <...> І шчасця большага // Не знаю я, // Як быць запісаным // У тваёй вечнай кнізе…» [7, с. 140].

З цягам часу ў паэзіі Максіма Танка на тэму прыроды з’явілася вострае экалагічнае гучанне. Ён разумеў, наколькі шкодным з’яўляецца знікненне прыродных рэалій, разбурэнне нацыянальнага светаўладкавання, а гэты негатыўны ўплыў найбольш адчуюць нашчадкі. Малюнкі прыроды-пакутніцы пранізаны пачуццём трывогі, болю за тое, што бяздумна руйнуецца, знішчаецца. Лірычны герой верша «Лес» жадае паслухаць птушыны хор у лесе, «чытаць пісьмёны дрэў» [7, с. 207], якія шмат чаго бачылі на

сваім вяку. Ён супрацьпастаўляе сваім імкненням мэты, якія ставяць перад сабой іншыя наведвальнікі лесу: пілаваць дрэвы і паляваць на птушак і звяроў. Людзі часцей пачалі думаць пра матэрыяльныя набыткі і ўсё больш забываюцца пра тую прыгажосць прыроды, якая нясе ў сабе эстэтычнае задавальненне таму, хто мае здольнасці любавацца і радавацца. Для паэтыкі некаторых вершаў экалагічнага зместу характэрны пералічэнні пейзажных вобразаў, з якімі паэт развітваецца, нібы з самым дарагім і блізкім на гэтым свеце. У свой памінальнік Максім Танк запісвае такія родныя, блізкія сэрцу вобразы – памерлых рэк, траў, диброў і іх жыхароў («Мой памінальнік»). Калі гараць тарфянікі, гінуць «Ягаднікі, багунне, сфагнум, // Гняздоўі качак, журавоў, // Звяроў лаговішчы і сховы…» [8, с. 213]. Паэт адчувае, як і ён «з зямлёю выгарае» [8, с. 167] («Пажар на тарфяніках»). Крык душы паэта чуецца ў вершаваных радках: «А за былой за стронгавай рачулкай, // Пахаванай у бетонных трубах, // Раскінуўся такі // Пейзаж індустрыяльны… [8, с. 127] («Усё больш і больш у небе…»). За пахаванне ракі нехта прэмію атрымаў, а ад развітальных слоў птушак здрыганулася «стальное сэрца бульдозера» [7, с. 233] («На пахаванне ракі»).

Разважанні пра экалагічную сітуацыю на планеце ў вершы «Вучоныя прадказваюць» паэт будуе на аснове прадказанняў вучоных пра чарговае абледзяненне кантынентаў. Ён прымушае чытача задумацца: што знойдуць нашчадкі «На ізноў адтаяўшай зямлі»? Гэта будуць «Бітоны з гербецыдамі // І бактэрыямі чумы // І іншыя сучасныя сродкі // Знішчэння жыцця». Рэакцыяй будзе здзіўленне і сумненне ў тым, «Што іх прабацькам быў // Homo sapiens» [7, с. 307].

Пасля чарнобыльскай катастрофы драматызм паэтычнага светабачання Максіма Танка яшчэ больш узмацніўся, набыў рысы трагічнага (адна з сутнасных катэгорый-праяў эстэтыкі): «Цябе параўноўвалі // З лістам кляновым, // З шыпшынавай кветкай // Агнёва-барвовай, // А мне ты здаешся // Ад ран агнявых // Гарачым – успляскам // Ахвярнай крыві» [8, с. 215]. Пейзажны вобраз роднай зямлі у танкаўскай паэзіі пачаў успрымацца з экалагічнай абвостранасцю пачуцця: «Замест святых імён // Рэк. Ніў, Лясоў і сёл // Маёй радзімы // Кароткі надпіс: // Калісьці // Была тут Беларусь» [8, с. 231]. Адчуванні страху, болю, горычы ахопліваюць аўтара, таму што звычайныя з’явы прыроды (вецер, хмара, дождж) цяпер нясуць небяспеку, хваробы, смерць. Як малое дзіця суцяшае маці, так імкнецца лірычны герой верша «Усе беды – вон, вон…» суцешыць Зямлю-карміцельку песняй, адчуваючы «яе глыбокую трывогу», таму што яна спрадвеку клапацілася пра чалавека і «крыўд ад яго // Найбольш зазнала» [8, с. 78]. У вершы «Самае доўгае расстанне» з дапамогай гіпербалы паказваюцца маштабы чарнобыльскай катастрофы, пасля якой прыйдзецца расстацца з «амярцвелай» зямлёй «на дзясяткі тысяч год» [8, с. 202]. З трагізмам расказвае паэт пра асірацелую тэрыторыю, з якой перасялілі людзей пасля чарнобыльскай аварыі, тут

«усё ў душы ледзянее» [8, с. 284] («З новага апакаліпсіса»). Заступнікі-абразы, «пакінутыя ў каравуле», больш нікому не патрэбныя. Былы рай ператварыўся ў пекла, дзе няма нават чорта. Зямлю асіраціла «забойчая пошасць Чарнобыля» [8, с. 284]. Думка аўтара набывае маральна-публіцыстычную завостранасць. У паэтычным свеце сутыкнуліся прыгожае і пачварнае, зямное і разбуральнае, жыццё і смерць. Такім чынам, паэзія Максіма Танка, апрача іншага, мае выразную экалагічную скіраванасць. Экалагічны імператыў вызначальны ў мастацка-творчым мысленні і светаасэнсаванні паэта. У абароне прыроды, роднай зямлі, жыцця яскрава выявілася актыўная грамадзянская пазіцыя Максіма Танка.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. *Бельскі А.* Галасы і вобразы: літ.-крытыч. артыкулы. Мінск : Лит. и Искусство, 2008.
2. *Бельскі А.* Класікі і сучаснікі ў школе. Мінск : Аверсэв, 2005.
3. Эстетика: словарь / под общ. ред. А. А. Беляева URL: https://platona.net/load/knigi_po_filosofii/slovari_ehnciklopedii/estetika-slovar-belyaev (дата звароту: 27.11.2022).
4. *Калеснік У.* Максім Танк: нарыс жыцця і творчасці. Мінск : Маст. літ., 1981.
5. Паэтыка літаратурных сувязей / У. В. Гніламёдаў [і інш.]; навук. рэд.: У. В. Гніламёдаў, М. У. Мікуліч. Мінск : Беларус. навука, 2017.
6. *Танк М.* Збор твораў: у 13 т. / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы; падрыхт. тэкстаў і камент. С. У. Калядка, В. У. Карачун. Мінск : Беларус. навука, 2007. Т. 3: Вершы (1954–1964).
7. *Танк М.* Збор твораў: у 13 т. / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы; падрыхт. тэкстаў і камент. В. У. Карачун, Т. У. Мархель. Мінск : Беларус. навука, 2008. Т. 5: Вершы (1972–1982).
8. *Танк М.* Збор твораў: у 13 т. / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы; падрыхт. тэкстаў і камент. Т. У. Мархель. Мінск : Беларус. навука, 2007. Т. 6: Вершы (1983–1995).